УДК 811.161.3 (072)

# Праблема фарміравання функцыянальнай пісьменнасці ў айчыннай педагогіцы

**Васюковіч Людміла Сяргееўна,**
дацэнт кафедры правазнаўства
і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Віцебскага філіяла Міжнароднага
ўніверсітэта «МІТСО»,
доктар педагагічных навук, дацэнт;
*vasuk.mila@tut.by*

В статье рассматриваются достижения белорусской педагогики в вопросах формирования функциональной грамотности учащихся. Анализ нормативных документов, имеющихся научных и учебно-методических работ показывает, что функциональная грамотность признаётся научной и образовательной проблемой, приоритет которой предопределён современными ценностно-смысловыми ориентациями общества и показателями конкурентоспособности отечественной системы образования.

**Ключевые слова:** функциональная грамотность; отечественная педагогика; образовательные стандарты общего среднего образования; отраслевая научно-техническая программа «Функциональная грамотность».

Арыентацыя на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў замацавана ў «Адукацыйных стандартах агульнай сярэдняй адукацыі», зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.12.2018, і Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года [1]. Паспяховае дасягненне сфармуляваных канцэптуальных задач падразумявае такі ўзровень развіцця сістэмы адукацыі, які «адпавядае сучасным цывілізацыйным выклікам і прагназуе апераджальны характар пераўтварэнняў у галіне педагагічнай навукі і адукацыйнай практыкі» [2, с. 6]. Даследчыкі вызначаюць функцыянальную пісьменнасць як каштоўнасны прыярытэт сучаснай адукацыі [3, с. 69]. Якія трансфармацыі адбываюцца ў айчыннай педагогіцы ў кантэксце праблемы фарміравання функцыянальнай пісьменнасці?

Праблема, заяўленая ў вызначальных дакументах, на нашу думку, падразумявае вырашэнне першачарговых задач:

- асэнсаванне ролі і статусу функцыянальнай пісьменнасці ў працэсе фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў;

- прызнанне прыярытэту кампетэнтнасных адукацыйных вынікаў навучэнцаў на фоне прадметных ведаў;
- вызначэнне характару ўзаемадзеяння суб’ектаў адукацыйнага працэсу ў рэчышчы калектыўнай дзейнасці, супрацоўніцтва, наладжвання дыялогу;
- дамінаванне ў адукацыйным працэсе прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці — практыка-арыентаванай, даследчыцкай, праектнай;
- фарміраванне «мяккіх» навыкаў, якія забяспечваюць камфортную жыццядзейнасць асобы ў грамадстве.

Тэарэтычнае асэнсаванне паняцця функцыянальнай пісьменнасці паступова пераводзіць праблему ў практычны кантэкст, што надае яе вырашэнню выразны дзейнасны характар. Найноўшыя метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў-прадметнікаў паслядоўна ўключаюць раздзелы (параграфы), прысвечаныя спасціжэнню зместу, структуры і сутнасным характарыстыкам функцыянальнай пісьменнасці. Напрыклад, у гласарыі да вучэбнага выдання «Настольная кніга настаўніка гісторыі» азначэнне паняцця падаецца наступным чынам: «Функцыянальная пісьменнасць — вынік авалодання сістэмай кампетэнцый, якія дазваляюць эфектыўна ўжываць засвоеныя веды ў практычнай сітуацыі, здольнасць уступаць у адносіны з навакольным асяроддзем і максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім… Функцыянальная пісьменнасць уяўляе сабой вынік авалодання сістэмай прадметных кампетэнцый» [4, с. 263].

Спашлёмся яшчэ на прыклады. У дапаможніку для настаўнікаў матэматыкі функцыянальная пісьменнасць трактуецца як «інтэгральная якасць асобы, што фарміруецца з акцэнтаваннем на інварыянтных складовых паняцця: чытацкая, матэматычная і прыродазнаўчая пісьменнасць» [5, с. 14—15]. У якасці спосабаў дасягнення функцыянальнай пісьменнасці вучняў В. М. Пірутка разглядае рашэнне комплексных заданняў праз мадэліраванне прадметнага і сацыяльнага зместу пазнавальнай дзейнасці. Кантэкст падобных задач праецыруе ўмовы прымянення ведаў пры вырашэнні праблем з рэальнага жыцця навучэнцаў (пазнавальная, бытавая і грамадская сферы). На думку даследчыцы, для фарміравання матэматычнай пісьменнасці кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні павінны разглядацца праз прызму канцэптуальнага падыходу, які рэалізуе базісныя матэматычныя ідэі *прасторы і формы, пераменныя, колькасныя адносіны, змяненне і залежнасць* і інш. Пошукі аптымальнага рашэння падобных задач актуалізуюць веды навуковага і практычнага характару, акцэнтуюць поліварыянтнасць адказаў вучняў.

Сучасны стан айчынных даследаванняў праблемы прадстаўлены найперш набыткамі супрацоўнікаў навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (НІА). Навуковы калектыў установы валодае багатым вопытам правядзення даследаванняў у сферы адукацыі. Так, В. Ф. Русецкі, В. У. Зелянко фармулююць задачу фарміравання функцыянальнай пісьменнасці з пазіцыі прыярытэтаў дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі ў Беларусі. Вучоныя акрэсліваюць круг кампетэнцый для сучаснага выпускніка: здольнасць комплексна вырашаць праблемы, каардынаваць свае дзеянні з іншымі людзьмі, узаемадзейнічаць з імі, фармуляваць уласныя разважанні, прымаць на іх аснове рашэнні; валодаць крытычным мысленнем, крэатыўнасцю, эмацыянальным інтэлектам. Пад функцыянальнай пісьменнасцю даследчыкі разумеюць найперш «здольнасць і гатоўнасць да прымянення ў разнастайных жыццёвых сітуацыях атрыманых ведаў і сфарміраваных уменняў» [6, с. 12].

З мэтай павышэння якасці беларускай адукацыі зацверджана галіновая навукова-тэхнічная праграма «Функцыянальная пісьменнасць», разлічаная на 2021—2025 гады, задачы якой акрэслены наступным чынам: «Распрацаваць канцэптуальныя асновы фарміравання функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў на аснове аналізу і абагульнення айчыннага і замежнага навуковага і адукацыйнага вопыту. Распрацаваць патрабаванні да адукацыйных вынікаў навучэнцаў, якія адлюстроўваюць сфарміраванасць функцыянальнай пісьменнасці. <…> Распрацаваць… камплекты заданняў і матэрыялаў па вучэбных прадметах і дысцыплінах, па адукацыйных галінах, скіраваныя на развіццё функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў і падрыхтоўку педагагічных работнікаў да яе фарміравання» [6, с. 7].

У якасці вынікаў выканання ГНТП «Функцыянальная пісьменнасць» запланаваны публікацыі — манаграфіі, серыі навуковых артыкулаў у беларускіх і замежных выданнях, абароны дысертацый. Рэалізаваная праграма аб’ектыўна адлюструе нацыянальныя адукацыйныя рэаліі ў кантэксце міжнародных патрабаванняў да ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці. У кантэксце вышэйназванай праграмы супрацоўнікі НІА як вядучага навукова-педагагічнага цэнтра краіны забяспечваюць тэарэтычную платформу фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, неабходную для выяўлення, апісання, вытлумачэння і прагназавання сучаснай педагагічнай сітуацыі.

Аналіз айчыннымі экспертамі В. Л. Жук [7], Т. М. Канашэвіч [8], А. В. Пазняк [9] дасягненняў беларускіх вучняў у міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA-2018 (у кантэксце чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай пісьменнасці ў якасці складовых фуннкцыянальнай) дае права ацэньваць вынікі вучняў як вышэйшы за сярэдні міжнародны ўзровень. Выяўлены таксама тыповыя складанасці ў выкананні заданняў, якія звязаны з разуменнем і ацэнкай тэкстаў, пададзеных у розным фармаце (дыяграмы, схемы, графікі, табліцы і інш.), арыентаваных на распазнаванне, аналіз і вытлумачэнне сітуацыі (з’явы), на самастойнае фармуляванне гіпотэз і абгрунтаванне шляхоў рашэння задачы, а таксама на ацэнку і інтэрпрэтацыю (перанос у іншыя кантэксты) атрыманых вынікаў. Так, каля чвэрці беларускіх навучэнцаў не пераадолелі другі (парогавы) узровень па трох разнавіднасцях пісьменнасці (чытацкай — 23,4 %, матэматычнай — 29,4 %, прыродазнаўчай — 24,2 %). Найвышэйшыя (5-ы і 6-ы) узроўні змагла прадэманстраваць даволі абмежаваная колькасць удзельнікаў: па прыродазнаўчай пісьменнасці — 2,6 %, па чытацкай — 4,0 %, па матэматычнай — 7,3 % вучняў [10, с. 12].

На думку прафесара В. Л. Жук, цяжкасці абумоўлены тым, што ў падручніках, напрыклад па матэматыцы, для старшакласнікаў пераважаюць задачы з навуковым (матэматычным) кантэкстам; прыводзіцца невялікая колькасць міжпрадметных задач, практычна адсутнічаюць заданні са збыткоўнымі данымі ў невербальным выглядзе; не стае практыкаванняў на аналіз даных або тэксту, пастаноўку матэматычных задач, прымяненне атрыманых матэматычных вынікаў для вытлумачэння працэсаў і з’яў у іншым кантэксце. Большасць задач падразумявае непасрэднае выкарыстоўванне вядомых стандартных формул, тэарэм, алгарытмаў [11].

Аналіз нарматыўных дакументаў, наяўных даследаванняў сведчыць: функцыянальная пісьменнасць у айчыннай педагагічнай навуцы асэнсоўваецца як навуковая і адукацыйная праблема, дамінанта новых ведаў. Такі прыярытэт не выпадковасць, а заканамернасць, вызначаная сучаснымі каштоўнасна-сэнсавымі арыенцірамі, што

выступаюць індыкатарамі канкурэнтаздольнасці, своеасаблівымі паказчыкамі рэйтынгу эфектыўнасці нацыянальнай школьнай адукацыі. Набыткі ствараюць тэарэтычную базу для асэнсавання функцыянальнай пісьменнасці як самастойнага навуковага кірунку, інтэнсіфікуюць даследаванні, прысвечаныя зместавым аспектам паняцця. Павышаная ўвага да праблемы тлумачыцца сацыяльнай і асобаснай арыентацыяй сучаснай сістэмы адукацыі. Як зазначае У. І. Загвязінскі, «асобасная арыентацыя не засланяе сацыяльнай скіраванасці, фарміравання імкнення служыць грамадству і дзяржаве, не адмяняе пачуцця абавязку, калектывізму. Яна толькі патрабуе, каб чалавек уключаўся ў грамадскія працэсы як сацыяльна ўстойлівая і адначасова мабільная, свабодная і адказная, творчая асоба» [12, с. 10].

Сучасны этап асэнсавання праблемы пазначаны ўвагай да спецыфікі фарміравання розных відаў функцыянальнай пісьменнасці: моўнай, камп'ютарнай, музычнай, метадычнай і інш. У апошнія гады ў Беларусі актывізавалася выданне вучэбна-метадычных прац па папулярызацыі фінансавай, сацыяльнай, падатковай, лічбавай пісьменнасці. На сённяшні дзень разнавіднасці пісьменнасці ўяўляюць сабой стракатую карціну: *традыцыйная, палітычная, крытычная, экалагічная, рытарычная, метадычная, фінансавая, лічбавая, картаграфічная, камп'ютарная, субкультурная, электаральная (як ідэнтыфікатар грамадскай нормы), мастацка-эстэтычная, прававая, жыццёвая, аўдыявізуальная, грамадзянская, лагічная, кроскультурная, інструментальная, сацыяльна-камунікатыўная, маргінальная, медыяпісьменнасць, палітычная, крытычная* і інш.

У каардынатах беларускіх адукацыйных рэалій праблема вырашаецца на ўзроўні паспяхова абароненых кандыдацкіх дысертацый па фарміраванні *аўдыявізуальнай пісьменнасці* старшакласнікаў сродкамі анімацыйнага кіно [13]. Функцыянальная пісьменнасць даследавана *ў кантэксце спецыяльнай педагогікі* [14]. На нашу думку, у пералік даследаванняў, выкананых па праблеме функцыянальнай пісьменнасці, варта ўключыць дысертацыю В. І. Цырынавай, дзе фарміраванне ўменняў усведамляецца як мэтанакіраваная праца па засваенні спосабаў ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці (калі характарызаваць гэты працэс у адпаведнай для сённяшняй адукацыйнай парадыгмы тэрміналогіі). Праца, выкананая ў 2006 годзе, адпавядае сутнасным ідэям сучаснай методыкі фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, тым больш што аўтар аналізуе вылучаныя ўменні (напрыклад, прымаць вучэбную мэту і фармуляваць задачы ажыццяўлення дзейнасці, выдзяляць вучэбную задачу, аналізаваць яе ўмову, вызначаць паслядоўнасць выканання дзеянняў, планаваць этапы дзейнасці, ажыццяўляць кантроль/самакантроль/ацэнку/самаацэку) як асноўныя складовыя ўменне вучыцца [15].

Пра запатрабаванасць даследаванняў праблем функцыянальнай пісьменнасці сведчыць і шматаспектнасць, шматпланавасць дэфініцыі, спробы структураваць паняцце праз вылучэнне яго складовых. Гэта зразумела: паняційны апарат канчаткова не сфарміраваны, дэталізацыя дэфініцыі эвалюцыянуе ў адпаведнасці са зменамі ў адукацыі, грамадстве. Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці не завяршаецца з набыццём агульнай сярэдняй адукацыі. Гэты працэс працягваецца пастаянна, паколькі «трансфармацыі ў каштоўнасных арыенцірах адбываюцца ў каардынатах сацыяльных спадзяванняў на школу, якія змяняюцца з развіццём грамадства» [16, с. 282]. Зместавае напаўненне разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці эвалюцыянуе разам з ускладненнем па-

трабаванняў да сістэмы адукацыі, якія прадвызначаюць наступныя параметры:

- пастаянная зменлівасць, залежная ад сацыяльнага заказу ўстановам агульнай сярэдняй адукацыі. Напрыклад, дапаўненне пераліку кампетэнцый паняццем *глабальная пісьменнасць*, уведзеным упершыню ў рамках міжнародных даследаванняў PISA ў 2015 годзе. Дадзеная пісьменнасць уключае гатоўнасць разумець і прымаць каштоўнасці, меркаванні, пазіцыі іншых людзей, здольнасць да ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі другіх культур. Увядзенне паняцця дазваляе ўдакладніць агульны змест пісьменнасці, інтэрпрэтаваць яго не толькі як здольнасць выкарыстоўваць, трансфармаваць інфармацыю, але і як уменне кантактаваць, знаходзіць шляхі разумення з суб'ектамі камунікацыі;
- арыентаванасць на будучае, што выяўляецца ў імкненні арганізаваць адукацыйную прастору з улікам «зоны найбліжэйшага развіцця», актуалізаваць фарміраванне відаў пісьменнасці, абумоўленых жыццёвымі патрэбнасцямі асобы, узроўнем адукацыі, вопытам і індывідуальнымі здольнасцямі;
- дзейнасны характар пазнання, сінтэз універсальных уменняў, іх гарманізацыя з прадметнымі ведамі;
- імкненне ажыццяўляць выбар, зыходзячы з адэкватнай ацэнкі ўласных магчымасцей у канкрэтнай сітуацыі.

Асноўнымі дакументамі, што вызначаюць перспектыўныя вектары развіцця адукацыі ў адпаведнасці з дзяржаўнай палітыкай, з'яўляюцца адукацыйныя стандарты пачатковай, базавай і сярэдняй адукацыі, якія забяспечваюць адзінства адукацыйнай прасторы, пераемнасць ступеней адукацыі, агульнасць метадалагічных і духоўна-маральных арыенціраў выхавання і навучання. У кантэксце запытаў інфармацыйнага грамадства стандарты актуалізуюць пазнавальныя, камунікатыўныя, каштоўнасна-арыентацыйныя кампаненты адукацыйных вынікаў у фармаце асобасных, прадметных і метапрадметных кампетэнцый. Адукацыйны стандарт як нарматыўны дакумент вызначае ўзровень засваення сістэмы ведаў, уменняў, неабходных для развіцця кампетэнцый, праектуе своеасаблівы «партрэт» сучаснага выпускніка, яго маральныя якасці, спосабы назапашвання сацыяльнага вопыту, метады і прыёмы фарміравання гатоўнасці асобы да ўзаемадзеяння з іншымі членамі грамадства.

Фармулююцца патрабаванні да вучэбных праграм, умоў іх рэалізацыі і — што надзвычай важна — вынікі засваення адукацыйных праграм. Акцэнтуецца станаўленне асобы навучэнца як носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, грамадзяніна і патрыёта, а таксама развіццё творчых здольнасцей, формы ўдзелу ў сацыяльна значнай дзейнасці.

Прыводзіцца пералік уменняў і навыкаў, што павінны быць засвоены ў межах кожнага вучэбнага прадмета. Актуалізуецца неабходнасць развіцця функцыянальнай пісьменнасці як асновы адукацыйных дасягненняў. Гэта паняцце ў стандартах ужываецца спарадычна, напрыклад пры фармулёўцы мэты базавай адукацыі: «Дасягненне выпускнікамі ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці, неабходнай у сучасным грамадстве як па матэматычным і прыродазнаўчым, так і па гуманітарным і сацыякультурным кірунках, валоданне агульнымі ўменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці, кампетэнцыямі, неабходнымі для сацыялізацыі, свядомага і адказнага выбару жыццёвага і прафесійнага шляху» [17]. Узнікае пытанне: якія аспекты зместу дакумента даюць падставу сцвярджаць пра карэляцыю паняццяў «функцыянальная пісьменнасць» і «адукацыйныя вынікі», зафіксаваных у стандартах?

*Па-першае,* прызнанне кампетэнтнаснага падыходу ў якасці прыярытэтнага, «скіраванага на фарміраванне кампетэнцый, універсальных вучэбных дзеянняў, узмацненне практычнай скіраванасці пазнавальнай дзейнасці» [17], што і запатрабавала фармулёўкі адукацыйных вынікаў у кампетэнтнасным фармаце.

*Па-другое,* стандарты, арыентаваныя на дасягненне навучэнцамі інтэграваных вынікаў (асобасных, метапрадметных, прадметных), прадугледжваюць: выпускнікі засвойваюць сукупнасць звестак, выкарыстоўваюць іх у тыповых і нестандартных сітуацыях, што патрабуе сінтэзу ведаў і сацыяльнага вопыту: «Для стымулявання пазнавальнай дзейнасці неабходна фарміраваць веды, шукаць шляхі для іх дасягнення, планаваць паслядоўнасць вучэбных дзеянняў, аналізаваць іх розныя варыянты, ацэньваць магчымыя вынікі, мадэліраваць спосабы рашэння сітуацыйных задач, ствараць мадэлі рэальнага жыцця» [17].

*Па-трэцяе,* стандарты пастуліруюць правобраз выпускніка, які ўмее дзейнічаць у розных жыццёвых абставінах, што з'яўляецца своеасаблівым крытэрыем сфарміраванасці кампетэнцый. Функцыянальная пісьменнасць характарызуецца найперш назапашаным вопытам, уменнем вырашаць нестандартныя задачы, дзейнічаць у нязвыклых умовах і з'яўляецца асновай супрацоўніцтва ў дынамічным соцыуме. Як сведчаць навукоўцы, «функцыянальна пісьменны чалавек — той, які здольны выкарыстоўваць набытыя на працягу жыцця веды, уменні, навыкі для вырашэння максімальна шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах чалавечай дзейнасці, зносін і сацыяльных кантэкстах» [18, с. 35].

Сфармуляваныя стандартамі адукацыйныя вынікі непасрэдна суадносяцца з чытацкай, матэматычнай і прыродазнаўчай пісьменнасцю як кампанентамі функцыянальнай пісьменнасці, цэласна адлюстроўваюць метапрадметныя дасягненні. Іх можна супаставіць з паняццем *ключавыя кампетэнцыі,* якія, маючы метапрадметны характар, вызначаюць гатоўнасць навучэнцаў да інтэграцыі пазнавальных і практычных уменняў як асновы для паспяховых рашэнняў, што не супярэчаць маральным і этычным нормам асобы. Адукацыйныя вынікі непасрэдна звязаны са складовымі функцыянальнай пісьменнасці агульным — *вынікова-дзейнасным* — кампанентам: «Прымаць вучэбную задачу, кіравацца ёю ў пазнавальнай дзейнасці, планаваць свае дзеянні, вызначаць іх алгарытм, ажыццяўляць ацэнку ўласных рашэнняў, задумвацца над прычынамі асабістых поспехаў або няўдач у вучэбнай дзейнасці, выяўляць памылкі і выпраўляць іх, карэкціраваць працу ў ходзе яе выканання» [17]. Вынікова-дзейнасны характар фармулёвак абумоўлены практыка-арыентаваным, сістэмна-дзейнасным падыходамі як метадалагічнай асновай распрацаванага дакумента. *Кампаненты функцыянальнай пісьменнасці* — чытацкая, матэматычная, прыродазнаўчая — раскрываюцца ў кантэксце метапрадметнасці, а спосабы і аб'ём іх засваення канкрэтызуюцца праз прадметныя веды і ўменні.

Зазначым: *дасягненне ўсіх кампанентаў функцыянальнай пісьменнасці немагчыма без чытацкай пісьменнасці ў якасці базы кагнітыўнай дзейнасці,* абумоўленай інтэграваным характарам чытання як віду маўленчай дзейнасці. У адукацыйных стандартах сістэматычна падкрэсліваецца значэнне чытацкай пісьменнасці праз агульную звышзадачу — развіццё чытацкай культуры на ўзроўні кожнага вучэбнага прадмета (працаваць з матэматычным/фізічным/біялагічным тэкстамі, здабываць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, прадстаўленую ў розных фарматах (табліцы,

дыяграмы, графікі, схемы і г. д.), адэкватна ўспрымаць, аналізаваць і даваць ацэнку медыятэкстам). Чытацкая пісьменнасць разумеецца складальнікамі адукацыйных стандартаў не як элементарнае валоданне тэхнікай чытання, але найперш як здольнасць свабодна выкарыстоўваць навыкі і ўменні чытання для атрымання інфармацыі з тэксту з мэтай яго разумення, кампрэсіі, трансфармацыі.

Чытацкая пісьменнасць як базавая складовая знаходзіцца ў аснове іншых кампанентаў функцыянальнай пісьменнасці. У адукацыйных стандартах асэнсаванае чытанне ўсведамляецца найважнейшым метапрадметным вынікам вывучэння розных прадметаў. У сумарным выглядзе чытацкія ўменні разгортваюцца ў сучасным трохадзінстве: *знаходзіць інфармацыю* ў тэкстах з рознымі фарматамі прадстаўлення (тэкставым, візуальным, схематычным, картаграфічным і інш.); *інтэграваць і інтэрпрэтаваць змест тэкстаў; ацэньваць прачытанае*.

Такім чынам, у адукацыйных стандартах паняцце *функцыянальнай пісьменнасці* аперацыяналізуецца праз вылучэнне сістэмы ведаў, уменняў, каштоўнасцей, што складаюць аснову для адукацыйных вынікаў па кожным вучэбным прадмеце; асэнсаванне кампетэнцый як здольнасці выкарыстоўваць веды ў практычнай дзейнасці, праводзіць рэфлексійны аналіз пазнавальнай дзейнасці, улічваць дыялогавую скіраванасць і камунікатыўныя магчымасці вучэбнага прадмета; стратэгіі асобаснага развіцця навучэнцаў, што выяўляюць інтэлектуальны і маральна-этычны профіль сучаснага выпускніка: носьбіт каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, здольны да гарманічнага ўзаемадзеяння з іншымі суб’ектамі адукацыйнага працэсу, да канструктыўнага дыялогу, крытычнага ўспрымання інфармацыі, атрыманай з розных крыніц.

Сфарміраваная функцыянальная пісьменнасць цэласна рыхтуе навучэнца да вырашэння як пазнавальных, так і практычных задач. Адукацыя павінна быць скіравана на «паўнацэннае функцыянаванне асобы ў сучасным грамадстве, вырашэнне шырокага дыяпазону задач у разнастайных сферах чалавечай дзейнасці, зносін і сацыяльнага ўзаемадзеяння» [10, с. 28]. У змесце сучасных адукацыйных стандартаў асноўныя кампаненты функцыянальнай пісьменнасці — чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай — непасрэдна сфармуляваны праз змест кожнага вучэбнага прадмета. Разнавіднасці функцыянальнай пісьменнасці паўнацэнна прадстаўлены на трох узроўнях: *інфармацыйная* (уменне атрымліваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю з розных крыніц), *камунікатыўная* (уменне эфектыўна абменьвацца інфармацыяй, здольнасць да ўзаемадзеяння з іншымі суб’ектамі адукацыйнага працэсу, канструктыўнага дыялогу, ролі маўленчага партнёра), *сацыяльная* (уменне прымяняць інфармацыю ў сацыяльнай практыцы; мадэліраванне сітуацый вырашэння камунікатыўных задач) *пісьменнасць*.

Прыведзены ў адукацыйных стандартах канкрэтызаваны пералік уменняў па розных вучэбных прадметах выяўляе агульныя дамінанты, што характарызуюць функцыянальную пісьменнасць: інтэграваны падыход да вынікаў (асобасныя, метапрадметныя і прадметныя); гатоўнасць прымяняць атрыманыя веды як у рамках адукацыйнага працэсу, так і ў рэальных сітуацыях; засваенне алгарытмаў пошуку нестандартных рашэнняў; валоданне прыёмамі вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці; веданне працэдур ацэньвання ўласных дасягненняў, методык рэфлексійнай дзейнасці; уменне самастойна знаходзіць выхад з праблемных сітуацый; уменне планаваць і ацэньваць пазнавальную дзейнасць індывідуальна і калектыўна.

У адукацыйных стандартах агульнай сярэдняй адукацыі тэрмін прыводзіцца аднаразова, аднак на зместавым узроўні дакумента выразна прадвызначаны вектары развіцця функцыянальнай пісьменнасці:

- трансфармацыя сучаснай адукацыйнай парадыгмы ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу;
- эвалюцыя зместу навучання, акцэнтаванне міждысцыплінарных сувязей, вырашэнне сітуацыйных нестандартных задач, якія разглядаюць праблемы, рэальныя сітуацыі ў кантэксце рознааспектных каардынат: грамадскае/асабістае жыццё, адукацыя, будучая прафесійная дзейнасць і інш. Такія заданні, як правіла, патрабуюць творчай актыўнасці, нестандартнага мыслення (напрыклад, *матэматычную задачу — вылічэнне працэнтаў — можна сфармуляваць па-за прадметнымі межамі: разлічыць працэнтную стаўку па крэдыце за пакупку новага камп'ютара для маці*). Аналіз практычных сітуацый актуалізуе ролю матэматычнага кампанента функцыянальнай пісьменнасці — уменне фармуляваць праблему на мове матэматыкі, трансфармаваць матэматычныя паняцці, факты, працэдуры, выкарыстоўваць і ацэньваць ролю прадметных ведаў у жыцці;
- абнаўленне працэдур ацэньвання якасці падрыхтоўкі навучэнцаў з улікам сучасных адукацыйных тэндэнцый;
- павышэнне матывацыі суб'ектаў адукацыйнага працэсу, зацікаўленасць у выніках, станоўчай дынамікі дасягненняў.

Такім чынам, зместавае напаўненне паняцця *функцыянальная пісьменнасць* змяняецца разам з развіццём грамадства і патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да ўзроўню адукацыі. Вызначальнымі параметрамі дэфініцыі выступаюць наступныя:

- функцыянальная пісьменнасць з'яўляецца лагічнай складовай адукацыйных вынікаў, непасрэдна звязана з паняццем «кампетэнцыі»;
- функцыянальная пісьменнасць ёсць аснова для фарміравання кампетэнцый;
- функцыянальная пісьменнасць уяўляе сабой сукупнасць ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў самастойнай дзейнасці, звязаных з успрыманнем, трансфармацыяй інфармацыі, са здольнасцю вырашаць задачы ў розных сферах жыццядзейнасці;
- функцыянальная пісьменнасць — гэта здольнасць да кампетэнтных і эфектыўных дзеянняў, ад сфарміраванасці якой залежыць рэалізацыя жыццёвых інтарэсаў асобы ў соцыуме.

Аналіз вырашэння праблемы дае падставу для наступных высноў:

- множнасць вылучэння (часам беспадстаўнае, нематываванае) разнавіднасцей пісьменнасці нагадвае «парад пісьменнасцей» (па аналогіі з выразам «парад парадыгм як рэакцыя на мноства разнавіднасцей адукацыйных парадыгм у педагагічных даследаваннях») [19, с. 68];
- мноства дэфініцый функцыянальнай пісьменнасці, адрозных ад класічнай формулы азначэння, пры адсутнасці родавага адзінства ўяўляюць сабой дастаткова суб'ектыўнае разуменне паняцця. Як справядліва зазначаюць даследчыкі, «каб выдзеліць у такіх выпадках галоўнае, сутнаснае для сучаснай педагогікі, неабходны пошук канцэптаў… Ускладненне сённяшняй педагагічнай рэальнасці патрабуе яе метадалагічнага абгрунтавання» [20, с. 26];
- рознатыповасць структуры функцыянальнай пісьменнасці, разнароднасць родавага кампанента наяўных дэфініцый, вызначэнне функцыянальнай

пісьменнасці праз *узровень ведаў і ўменняў, узровень адукаванасці; веды, уменні, навыкі, спосабы дзейнасці; здольнасць асобы набываць і выкарыстоўваць веды; сацыяльна-педагагічную характарыстыку асобы; здольнасць прымяняць універсальныя метады дзейнасці* прыводзяць да метадалагічнага дысанансу, выкліканага некрытычным асэнсаваннем тэрміна. Паняцце павінна быць цэласным, інтэграваным, міждысцыплінарным, адэкватным сучаснаму разуменню і характару культурна-інфармацыйнага адукацыйнага асяроддзя. У сучасным кантэксце функцыянальная пісьменнасць «прарастае» ў культуры, становіцца спосабам гарманічных адносін з соцыумам, выступае цэласнай характарыстыкай навучэнца як носьбіта нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей у адзінстве ведавай, дзейнаснай і аксіялагічнай падструктур.

Такім чынам, на сённяшні дзень назапашаны дастаткова багаты арсенал даследаванняў па праблеме функцыянальнай пісьменнасці. Апублікаваны працы расійскіх філосафаў, педагогаў, псіхолагаў, сацыёлагаў (С. Г. Вяршлоўскі, Б. С. Гершунскі, І. А. Калеснікава, А. Е. Лебедзеў, Л. М. Пермінава, І. У. Шутава і інш.), беларускіх вучоных (Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, М. Б. Гарбунова, А. А. Гулецкая, С. І. Колбышава, С. А. Крупнік, У. У. Мацкевіч, В. Ф. Русецкі, В. Р. Стуканаў, В. І. Цірынава, М. Г. Яленскі і інш.). Распрацоўваюцца метадычныя аспекты фарміравання кампанентаў функцыянальнай пісьменнасці ў працэсе вывучэння школьных дысцыплін (В. У. Бурак, В. Л. Жук, Т. М. Канашэвіч, А. В. Пазняк, В. І. Цірынава, Т. Я. Ціравец і інш.). Маюцца станоўчыя вынікі беларускіх навучэнцаў у міжнародных даследаваннях PISA. Аднак айчыннай школе трэба зрабіць крок наперад у плане практычнага выхаду за межы звыклых, стэрэатыпных вучэбных сітуацый, стандартызаваных задач у школьных падручніках. Варта пашыраць фармат заданняў, што патрабуюць комплекснай працы з тэкстам, скіраванай на разуменне, трансфармацыю, ацэнку інфармацыі.

Сучасная трактоўка функцыянальнай пісьменнасці акцэнтуе наступныя аспекты дэфініравання адзінкі, абумоўленыя відазмяненнем паняцця ў кантэксце патрабаванняў грамадства да сённяшняй сістэмы адукацыі:

- прыярытэт вынікаў навучання як адукацыйных і сацыяльных патрэбнасцей, рэалізаваных у інтарэсах асобы і грамадства;
- актуалізацыя сацыяльнага кантэксту фарміравання функцыянальнай пісьменнасці як выкарыстанне атрыманых ведаў, уменняў, вопыту ў канкрэтных сітуацыях для «рашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач» (А. А. Лявонцьеў);
- разуменне ўніверсальнага характару навыкаў працы з інфармацыяй у кантэксце функцыянальнай пісьменнасці, прызнанне інфармацыйна-тэкставых уменняў інтэграваным кампанентам агульнай пісьменнасці.

Адзначым, што не ўсе вучоныя схільныя разглядаць вынікі засваення адукацыйных праграм выключна ў фармаце функцыянальнай пісьменнасці (А. А. Лявонцьеў, М. А. Халодная і інш.). Гэта вымушае да неабходнасці пошукаў рацыянальнай асновы распрацоўкі інтэграваных методык. У сучаснай адукацыі перавага надаецца не толькі ведам, але і якасцям асобы, якія дапамагаюць хутка адаптавацца ў новых умовах, уменням самастойнага пошуку і трансфармацыі інфармацыі, навыкам вызначэння і вырашэння праблем, разумення таго, што прафесійнае станаўленне залежыць не столькі ад аб'ёму ведаў,

колькі ад сфарміраванасці функцыянальнай пісьменнасці і кампетэнцый. Як сцвярджае прафесар Г. У. Пальчык, «зменлівы свет патрабуе пастаяннай гатоўнасці вучыцца і развіваць навыкі на працягу ўсяго жыцця» [21, с. 6]. У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі найважнейшай задачай прызнаецца фарміраванне «мяккіх» навыкаў (soft skills): *камунікацыі* (устанаўленне кантактаў, уменне сфармуляваць уласны пункт погляду), *крэатыўнасці* (комплексная ацэнка сітуацыі і спосабы яе эфектыўнага рашэння), *кааперацыі* (уменне працаваць у камандзе), *крытычнага мыслення* (ацэнка інфармацыі для прыняцця адэкватнага рашэння).

Існуе пэўная рызыка засяроджанасці школьнай адукацыі толькі на развіцці функцыянальнай пісьменнасці вучняў. З аднаго боку, валоданне «наборам» разнавіднасцей пісьменнасці (чытацкая, лічбавая, інфармацыйная і інш.) — гэта аб’ектыўная патрэбнасць для забеспячэння якасці жыцця ў соцыуме. Дадзены «набор» можа папаўняцца пералікам новых кампетэнцый і разнавіднасцей пісьменнасці. З другога боку, сфакусіраванасць адукацыйных мэт толькі на прагматычнасці функцыянавання чалавека ў грамадстве ўтрымлівае небяспеку «засланіць» змест крэатыўнай дзейнасці, суб’ектнасці, індывідуальнасці асобы. У гэтым рэчышчы надзвычай важна захаваць рацыянальны баланс паміж «цвёрдымі» і «мяккімі» кампетэнцыямі, што фарміруюць інтэлектуальны і творчы патэнцыял асобы, грамадства, дзяржавы.

**Літаратура**


1. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda. — Дата доступа : 12.10.2023.
2. *Русецкий, В. Ф.* Перспективные фундаментальные научные исследования Национального института образования / В. Ф. Русецкий, О. В. Зеленко // Веснік адукацыі. — 2021. — № 4. — С. 5—11.
3. *Валочка, Г. М.* Функцыянальная адукаванасць навучэнцаў як каштоўнасны прыярытэт сучаснай моўнай адукацыі / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко // Роднае слова. — 2023. — № 7. — С. 69—72.
4. *Корзюк, А. А.* Настольная кніга настаўніка гісторыі : вучэб. дапаможнік / А. А. Корзюк. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023. — 267 с.
5. *Пирютко, О. Н.* Методика преподавания математики в 5—6 классах. Функциональная грамотность : пособие для учителя / О. Н. Пирютко. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2023. — 199 с.
6. *Ру*сецкий, В. Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В. Ф. Русецкий, О. В. Зеленко // Веснік адукацыі. — 2020. — № 11. — С. 5—13.
7. *Жук, О. Л.* PISA-2018 в Республике Беларусь. Математическая грамотность / О. Л. Жук ; под науч. ред. Г. С. Ковалёвой. — Минск : Медисонт, 2021. — 50 с.
8. *Канашевич, Т. Н.* PISA-2018 в Республике Беларусь. Естественнонаучная грамотность / Т. Н. Канашевич ; под науч. ред. Г. С. Ковалёвой. — Минск : Медисонт, 2021. — 62 с.
9. *Позняк, А. В.* PISA-2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А. В. Позняк ; под науч. ред. Г. С. Ковалёвой. — Минск : Медисонт, 2021. — 68 с.
10. *Титовец, Т. Е.* PISA-2018 в Республике Беларусь. Общая характеристика исследования. Социокультурный контекст / Т. Е. Титовец, М. Б. Горбунова, О. В. Бурак ; под науч. ред. Г. С. Ковалёвой. — Минск : Медисонт, 2021. — 112 с.

11. *Жук, О. Л.* Математическая грамотность учащихся в исследованиях PISA : сущность, результаты и условия формирования / О. Л. Жук // Адукацыя і выхаванне. — 2021. — № 9. — С. 3—14.
12. *Загвязинский, В. И.* Теория обучения. Современная интерпретация : учеб. пособие / В. И. Загвязинский. — М. : Академия, 2016. — 187 с.
13. *Колбышева, С. И.* Формирование аудиовизуальной грамотности старшеклассников средствами анимационного кино (на материале факультативных занятий «Искусство кино») : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / С. И. Колбышева ; Витебский гос. ун-т им. П. М. Машерова. — Витебск, 2011. — 26 с.
14. *Жлудова, Н. С.* Формирование грамотности у старшеклассников с интеллектуальной недостаточностью : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.03 / Н. С. Жлудова ; Национальный институт образования. — Минск, 2016. — 28 с.
15. *Тиринова, О. И.* Формирование умений учебной деятельности у младших школьников : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / О. И. Тиринова ; Белор. гос. пед. ун-т им. М. Танка. — Минск, 2006. — 22 с.
16. *Лебедев, О. Е.* Воспитание в школе : диалектика прошлого и будущего : монография / О. Е. Лебедев. — СПб. : СПбГУП, 2022. — 348 с.
17. Образовательные стандарты Республики Беларусь [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. — Дата доступа : 12.10.2023.
18. Образовательная система «Школа — 2100». Педагогика здравого смысла : сб. материалов / под науч. ред. А. А. Леонтьева. — М. : Баласс, Издательский Дом РАО, 2003. — 367 с.
19. *Краевский, В. В.* Методология педагогики : новый этап : учеб. пособие / В. В. Краевский, Е. В. Бережнова. — М. : Академия, 2006. — 393 с.
20. Систематика терминологического аппарата педагогики в условиях парадигмальных изменений как фактор обновления содержания педагогического образования : монография / А. И. Жук [и др.] ; под науч. ред. : А. В. Торховой, О. Б. Даутовой. — Минск : БГПУ, 2019. — 306 с.
21. *Пальчик, Г. В.* Профессиональная ориентация как объект научных исследований и социально значимое направление образовательной деятельности / Г. В. Пальчик // Веснік адукацыі. — 2023. — № 1. — С. 5—11.

*Материал поступил в редакцию 04.12.2023.*

THE PROBLEM OF DEVELOPING FUNCTIONAL LITERACY IN DOMESTIC PEDAGOGY

Lyudmila S. Vasyukovich,
Associate Professor of the Department of Law and Social and
Humanitarian Disciplines of Vitebsk Branch of the International University «MITSO»,
Dr. Sci. (Pedagogics), Associate Prof.; *vasuk.mila@tut.by*

The article examines the achievements of Belarusian pedagogy in the formation of functional literacy of students. An analysis of regulatory documents, existing scientific and educational works shows that functional literacy is recognized as a scientific and educational problem, the priority of which is predetermined by modern value-semantic orientations of society and indicators of competitiveness of the domestic education system.

Keywords: functional literacy; domestic pedagogy; educational standards of general secondary education; branch scientific and technical program «Functional Literacy».

*Submitted 04.12.2023.*